СУСТРЭЧЫ

# Як газетныя праекты становяцца кнігамі

**СМАРГОНЬ. На сустрэчах з моладдзю райцэнтра сваю творчасць прадэманстравала аўтар кніг пра землякоў, публіцыст, краязнаўца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіна АНТОНАВА.**

Сустрэча супрацоўнікаў рэдакцыі газеты “Светлы шлях” са школьнікамі – падзея даволі частая ў жыцці юных смаргонцаў. Моладзь з цікавасцю прыходзіць у рэдакцыю, каб пазнаёміцца з работай мясцовых СМІ.

У снежні адбыліся тры такія сустрэчы – с вучнямі дзявятых класаў СШ №1 і №7, а таксама з дзесяцікласнікамі СШ №5 горада Смаргонь. Ва ўсіх мерапрыемствах удзельнічала член Саюза пісьменнікаў Беларусі, публіцыст, краязнаўца, журналіст газеты “Светлы шлях” Галіна Антонава.

Галіна Францішкаўна расказвала дзецям не толькі пра тонкасці журналісцкай працы. Яна аўтар шасці кніг: “Дзяруга”, “Лілія Трохалева. Веліч малой радзімы”, “Самародкі”, “Месца пад сонцам”, “Космас Анатоля Антонава” і “Знайсці сябе”. Таксама – укладальнік, стыль-рэдактар і адзін з суаўтараў раздзела кнігі вядомага смаргонскага ўрача Юрыя Чапёлкіна “Запіскі правінцыйнага хірурга”.

Старшакласнікі з цікавасцю слухалі аповед пра тое, як газетныя праекты становяцца кнігамі пра вядомых землякоў Смаргоншчыны. Школьнікі адкрылі для сябе новыя імёны таленавітых людзей рэгіёна, якія могуць стаць для іх у будучым пуцяводнымі зоркамі.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** публіцыст, краязнаўца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Галіна АНТОНАВА падчас сустрэч са старшакласнікамі школ горада Смаргонь. Снежань 2024 года. *(Фотаздымкі – з архіва рэдакцыі газеты “Светлы шлях”)*.




ДАБРО - НА ДОЎГАЕ ЗАХАВАННЕ
shliah.by


shliah.by


shliah.by


Лілія
Трохалева


shliah.by

